## Выстаўка ў штаб-кватэры ЮНЕСКА

**22 мая 2002 г.** у штаб-кватэры ЮНЕСКА ў Парыжы адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця выстаўкі, прысвечанай 200-й гадавіне з дня нараджэння выдатнага навукоўца і педагога, грамадскага дзеяча, ураджэнца Беларусі і нацыянальнага героя Чылі Ігната Дамейкі. Выстаўка праводзілася сумеснымі намаганнямі Беларусі, Літвы, Польшчы, Францыі і Чылі — краін, з якімі былі звязаны яго жыццё і дзейнасць.



Выступленне Генеральнага дырэктара ЮНЕСКА К.Мацууры на адкрыцці выстаўкі

І.Дамейка (1802—1889 гг.) нарадзіўся ў маёнтку Мядзведка, Карэліцкі раён Гродзенскай вобласці. Вучыўся ў Віленскім універсітэце, удзельнічаў у паўстанні 1830—1831 гг. З 1832 г. жыў у Парыжы, дзе скончыў Горную школу. У 1938 г. па запрашэнні ўрада пераехаў у Чылі, там правёў асноўную і плённую частку свайго жыцця. І.Дамейка арганізаваў вывучэнне геалогіі і мінералогіі Андаў, пустыні Атакама і правінцыі Араўканіі, заснаваў метэаралагічную службу, адкрыў медныя і сярэбраныя капальні, наладзіў золатаздабычу і здабычу салетры, увёў метрычную сістэму мер і вагі, напісаў шэраг падручнікаў, быў абраны рэктарам універсітэта ў Сант'яга.

Чылійскі ўрад абвясціў І.Дамейку нацыянальным героем. Яго прозвішчам названы мінерал, расліна, горад і пасёлак, хрыбет у Андах, універсітэт і нацыянальная бібліятэка. У Сант'яга яму пастаўлены помнік. У былым фальварку І.Дамейкі (в. Заполле Лідскага раёна) адкрыты музей славутага земляка.

Урадам Беларусі створаны арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы святкавання 200-годдзя з дня нараджэння І.Дамейкі. На верасень у Мінску запланавана прысвечаная гэтай даце навуковая канферэнцыя.